> Але самым жаданым госцем у Сцепчанкі дома і ў калгасе пачынаючы з 1959 года быў сябра яго дзяцінства Андрэй Макаёнак.

# ГЕРОЙ ВАЙНЫ І ПРАЦЫ, ЛІТАРАТУРНЫ ГЕРОЙ

**Уладзімір Афанасьевіч Сцепчанка... Ён жыве яшчэ ў памяці маіх землякоў - людзей старэйшага пакалення. Помняць як тактоўнага, умелага і вельмі здольнага кіраўніка ў галіне сельскай гаспадаркі, старшыню былога калгаса "Новае Палессе". Сёлета яму споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння.**



Уладзімір Афанасьевіч нарадзіўся 20 верасня 1920 года ў вёсцы Махавая Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. На яго долю выпалі першыя гады калектывізацыі, цяжкія, галодныя - гады выжывання. Але бацька працаваў сталяром - тым і жылі. Сын Валодзя пры ім навучыўся майстраваць, сталярнічаць. З тымі навыкамі пасля 8 класаў паступіў у Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум. Але з трэцяга курса быў накіраваны ў бранетанкавае вучылішча.

Уладзімір Сцепчанка на пачатку вайны служыў на Каўказе. У хуткім часе быў перакінуты на Украінскі фронт, дзе адразу ж трапіў у самае пекла: быў двойчы паранены, апошні раз - у верасні 1943 года. З палаючага танка ўцалелі двое: Удадзімір і Павел Патапкін (сустрэліся яны толькі праз 23 гады). Абгарэлы, Сцепчанка доўга лячыўся ў ваенных шпіталях. У маі 1944-га быў камісаваны як інвалід вайны.

Пасля вайны асноўныя этапы жыцця і працы Уладзіміра Афанасьевіча звязаны з развіццём і

што ў дні пасяўных і ўборачных кампаній ды і іншых адказных работ уставаў у 4 гадзіны ранку, да нарады са спецыялістамі паспяваў агледзець усе патрэбныя аб'екты, каб удала спланаваць рабочы дзень. А адным з важнейшых поспехаў працоўнага калектыву з'яўлялася дысцыпліна кожнага члена.

Пад кіраўніцтвам У. А. Сцепчанкі калгас "Новае Палессе"хутка набіраў тэмпы росту. Асушаныя землі Грычынскага балота давалі самыя высокія ўраджаі ў вобласці; ссяленне калгаснікаў з хутароў у вёскі дало магчымасць сканцэнтраваць рабочую сілу. За кароткі час у гаспадарцы ўмацавалася эканоміка, вырасла матэрыяльна-тэхнічная база, наладзіўся быт калгаснікаў. У вёсках забудоўваліся новыя прасторныя вуліцы з электрыфікацыяй, у тым ліку для калгаснікаў было пабудавана некалькі шматкватэрных дзвюхпавярховак. За сродкі гаспадаркі былі пабудаваны Дом культуры, праўленне калгаса, стадыён, у кожнай брыгадзе меліся дзіцячыя садкі і лазні.

У 1966 годзе У. А. Сцепчанку было прысвоена

пра бяду сябра, запрасіў Андрэя пажыць у яго. З

Уладзіміра Афанасьевіча звязаны з развіццём і станаўленнем беларускага Палесся: працаваў у райкамах і выканкамах Ганцавіцкага, Лунінецкага і былога Ленінскага раёнаў. У 1959 годзе Сцепчанка выбіраецца старшынёй калгаса.

Прыход Уладзіміра Афанасьевіча з пасады старшыні райвыканкама на пасаду старшыні адстаючай тады гаспадаркі "Сцяг камунізму" (пазней - "Новае Палессе"), да якога яшчэ далучылі суседні калгас з вялікімі даўгамі, - як подзвіг. Але арганізатарскія і гаспадарчыя здольнасці, уменне мысліць на перспектыву, уменне кіраваць кадрамі і трымаць цесны кантакт з радавымі працаўнікамі неўзабаве далі добры плён.

Дбаласць пра гаспадарку праяўлялася ў тым,

У 1966 годзе У. А. Сцепчанку было прысвоена ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Цесная дружба звязвала Уладзіміра Сцепчанку з Пятром Міронавічам Машэравым. Сцепчанка і Машэраў пазнаёміліся ў 1957 годзе. Тады Уладзімір Афанасьевіч працаваў старшынёй Ленінскага райвыканкама, а Пётр Міронавіч першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ. Летам 1959 года Машэраў прыязджаў да нас на адпачынак, а ў 1962 годзе, ужо будучы сакратаром ЦК КПБ, наведаўся з вялікай дэлегацыяй спецыялістаў, каб на аснове асушаных земляў стварыць паказальную гаспадарку. Па справах і на адпачынак Машэраў яшчэ два разы прылятаў у нашу вёску.



Але самым жаданым госцем у Сцепчанкі дома і ў калгасе пачынаючы з 1959 года быў сябра яго дзяцінства Андрэй Макаёнак. Уладзімір Афанасьевіч і Андрэй Ягоравіч - аднагодкі, нарадзіліся ў суседніх вёсках, разам вучыліся ў Шапчыцкай сямігодцы і крыху ў Журавіцкай СШ. Там некалькі гадоў сядзелі за адной партай, дзяліліся сваімі планамі і марамі, нават заляцаліся да аной і той жа дзяўчыны Дусі, якая потым стала жонкай Сцепчанкі.

На некаторы час шляхі сяброў разыходзіліся. Але сталася так, што ў Андрэя Ягоравіча пачаліся нелады з жонкай, і ён жыў за Мінскам на дачы. Адбыўся пажар, і дача згарэла. Сцепчанка, даведаўшыся пра бяду сябра, запрасіў Андрэя пажыць у яго. З таго часу Макаёнак бываў у Любані перыядычна, іншы раз жыў тыднямі. Бываў сярод калгаснікаў "Новага Палесся", размаўляў пра іх быт і жыццё, унікаў у вытворчыя справы калгаса, бываў на нарадах актыву гаспадаркі, радзіўся са Сцепчанкам.

На аснове ўсяго таго была напісана камедыя "Таблетку пад язык", з мясцовымі фактамі. У вобразах п'есы з'явіліся канкрэтныя людзі Любані, а асноўным героем твора быў старшыня Каравай, прататып якога - Сцепчанка. Твор, хоць і камедыйны, але ў ім узняты важныя тэмы: урбанізацыя, узаемаадносіны людзей, хабарніцтва.

Андрэй Макаёнак быў у адной звязцы з Дзяржаўным драматычным тэатрам імя Янкі Купалы. Таму Сцепчанка з ахвотай запрашаў купалаўцаў у Любанскі СДК. Тут ставіліся Макаёнкавы "Лявоніха на арбіце", "Трыбунал", ну і, вядома, "Таблетку пад язык".

У 1967 годзе да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі каля Любанскага СДК закладваўся парк. У пасадцы дрэў прынялі ўдзел і Сцепчанка з Макаёнкам. Дубы, ясені, клёны пасталелі і зараз высяцца, шумяць, напамінаючы пра верную дружбу тых верных сяброў.

Даўно няма ў жывых У.Сцепчанкі і А.Макаёнка, і паступова з прыходам новых пакаленняў згасае народная памяць пра гэтых вядомых у свой час людзей. За перыяд кіравання цяперашніх беларускіх уладаў знішчаны калгас "Новае Палессе", стаяць бязмоўна дзіцячы садок, КБА, медпункт, калгасная кантора, пад бульдозер пушчаны некаторыя гаспадарчыя пабудовы, лазня, заглох стадыён. Значна змяніўся Дом культуры. Але як візітная картка каля параднага ўваходу будынка месціцца мемарыяльная дошка, што сведчыць пра добрыя справы сяброў-таварышаў - старшыні калгаса і пісьменніка. На дошцы - здымкі У.А.Сцепчанкі і А.Я.Макаёнка і тэкст: "У перыяд з 1959 па 1974 гады Любань і наваколле неаднаразова наведваў славуты драматург, народны пісьменнік Беларусі Андрэй Ягоравіч Макаёнак. Прататыпам галоўнага героя яго п'есы "Таблетку пад язык" стаў тагачасны старшыня калгаса "Новае Палессе" Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Апанасавіч Сцепчанка".

І яшчэ адна памяць - цэнтральная вуліца Любані, дзе жыў У.Сцепчанка, носіць яго імя.

**Сцяпан Нефідовіч, в.Любань**